Радыё “Рацыя”
03.12.2019

**Кітабы – літаратурныя помнікі Беларусі**

Сярод літаратурных помнікаў Беларусі маюцца кітабы – рукапісныя кнігі, якія ствараліся на працягу стагоддзяў беларускімі татарамі. 27 лістапада ў Нацыянальнай бібліятэцы стартаваў семінар-практыкум, дзе кожны можа навучыцца расчытваць арабскую графіку.



Аб значэнні вывучэння кітабаў Беларусі расказвае дацэнт кафедры мовазнаўства і краіназнаўства Усходу факультэта міжнародных адносін БДУ Ірына Сынкова: – Ёсць у пэўных колах зацікаўленасць гэтымі матэрыяламі, матэрыяламі, як бачыце, унікальнымі.

Патрэбныя людзі, якія б гэтым сур’ёзна займаліся. Я апошнія гады займалася літаратурай беларускіх татараў і лічу, што гэта вельмі цудоўная крыніца для вывучэння гісторыі не толькі татарскай супольнай, але ўвогуле і Беларусі.

Лекцыі-практыкумы па чытанні кітабаў будуць праходзіць да траўня 2020 года на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Бліжэйшы занятак адбудзецца 4 снежня 2019 а 18-й гадзіне.




РАЦЫЯ


Татары
Вялікага
княства
Літоўскага
РАЦЫЯ